*І. М. Саматыя (Мінск), Т. А. Зезюлевіч (Новалукомль)*

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭХНАЛОГІІ “ПЕРАКУЛЕНАЕ НАВУЧАННЕ” НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Адукацыю ў якасці працэсу, што скіраваны на самаразвіццё асобы вучня, пашырэнне яго магчымасцей кампетэнтнага выбару свайго жыццёвага шляху, разглядае сучасная педагогіка. Галоўнай задачай установы агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца падрыхтоўка творчага і адукаванага грамадзяніна нашай краіны, які здольны да самаадукацыі і пастаяннага развіцця. Гэтае патрабаванне адзначалася ў розныя часы развіцця лінгваметадычнай навукі [гл., напрыклад, 1] і з’яўляецца асабліва актуальным запатрабаваннем нашага часу. Зразумела, што гэта патрабуе і ад сучаснага настаўніка беларускай мовы пошуку новых формаў, метадаў і прыёмаў навучання.

Вопытныя настаўнікі і метадысты пераконваюць нас, што так званы класічны камбінаваны школьны ўрок заўжды быў, ёсць і будзе існаваць доўгія дзесяцігоддзі, але без нетрадыцыйнага яго зместу, метадаў навучання зараз немагчыма абысціся, бо менавіта гэтыя метады і падтрымліваюць цікавасць сучасных падлеткаў-школьнікаў да прадметаў, павышаюць матывацыю іх вывучэння.

Такая праблема, як матывацыя вучобы, існавала і існуе ў вучэбна-выхаваўчым працэсе раней і зараз.

Калі разглядаць аб’ектыўна, то пры вызначэнні фактараў нежадання вучыцца трэба адзначыць нават недастаткова прафесійнае, нават пасіўнае псіхалагічнае суправаджэнне настаўнікам вучэбнага працэсу. Пытанне пра тое, якія прагрэсіўныя педагагічныя прыёмы можна выкарыстаць на занятках беларускай мовы і літаратуры з мэтай фарміравання і развіцця ў школьнікаў станоўчай пазнавальнай матывацыі да вучэбнай дзейнасці, хвалюе даволі даўно бацькоў, псіхолагаў, метадыстаў і настаўнікаў. Але не кожны настаўнік-філолаг акцэнтуе ўвагу на гэтай праблеме, бо ў асноўным лічаць, што калі юнак прыйшоў у школу, то ён абавязаны выконваць усё тое, што прапаноўвае педагог.

Значныя змяненні ў праграмах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, увядзенне ў гэтыя праграмы маўленчазнаўчых паняццяў (*тэкст, тып тэксту* і інш.) абумовілі ўзмацненне камунікатыўнай накіраванасці выкладання на беларускай мове.

З’яўленне разнастайных камунікатыўна-маўленчых праграм у пачатковай форме дыктуе патрэбу скаардынаваць навучанне ў пачатковым і сярэднім звяне. Змяненне прырытэтаў у навучанні мове, значная ўвага да развіцця асобы падлетка, неабходнасць фарміравання культуры маўленчых зносін – вось тыя фактары, якія патрабуюць змянення ў сістэме маўленчага развіцця школьнікаў.

У цэнтры ўвагі – падлетак (дзіця) як суб’ект, які зацікаўлены ў пазнанні, вывучэнні разнастайных законаў беларускай мовы і літаратуры і

правіл карыстання ёю, яго запатрабаванні ў сферы маўлення як форме грамадскай дзейнасці і спосабу праяўлення ўласнай жыццёвай актыўнасці – вось адметная асаблівасць сучаснай методыкі выкладання беларускай мовы.

На сённяшні дзень школа дае магчымасць самастойна папаўняць веды. Сучасная методыка [3] імкнецца засяродзіць увагу педагагічнай грамадскасці на сутнасці распрацаванай айчыннымі лінгвістамі і метадыстамі моўнай асобы і дзейнасным падыходзе да фарміравання такой асобы сродкамі прадмета “Беларуская мова”. Змест навучання беларускай мове фарміруецца з улікам індывідуальных псіхафізіялагічных і сацыяльна-педагагічных заканамернасцяў, найважнейшымі з якіх з’яўляюцца псіхафізіялагічнае і інтэлектуальнае развіццё школьнікаў, апора на дасягненні лінгвістычнай і педагагічнай навук, іх спецыфіку, узровень ведаў, маўленчых і аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў, якімі вучні ўжо валодаюць і якія неабходна засвоіць у працэсе працы.

Сёння асаблівая ўвага грамадства звяртаецца на метапрадметныя вынікі адукацыйнай дзейнасці, якія прадугледжваюць фарміраванне і развіццё асобасных якасцей і агульнай культуры навучэнцаў, разуменне каштоўнасці адукацыі, унутранай матывацыі і адказнасці за сваё навучанне.

У сучасным свеце ўсё больш актуальнымі становяцца пытанні, звязаныя з выкарыстаннем інфакамунікацыйных тэхналогій у навучальным працэсе, таму што менавіта яны ствараюць прынцыпова новыя магчымасці атрымання чалавекам ведаў. Сапраўды, прымяненне новых інфармацыйных тэхналогій дазваляе разнастаіць і камбінаваць сродкі педагагічнага ўздзеяння на вучняў, узмацніць матывацыю вучобы і палепшыць засваенне новага матэрыялу, дае магчымасць якасна змяніць самакантроль і кантроль над вынікамі навучання. Навучанне беларускай мове – менавіта тая вобласць, дзе выкарыстанне інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій можа прынцыпова змяніць і метады працы, і, што самае галоўнае, яе вынікі. Удасканаленне методыкі выкладання беларускай мовы з выкарыстаннем інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій павышае тэмп урока, а галоўнае, павялічвае долю самастойнай працы навучэнцаў. На ўроках беларускай мовы з дапамогай інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій можна арганізаваць выкананне ўсіх традыцыйных відаў практыкаванняў на зрокавае ўспрыманне, устаўку літар, пастаноўку знакаў прыпынку, рэдагаванне тэксту. Неабходную інфармацыю можна вылучаць, напрыклад, у табліцах і правілах патрэбную літару можна рабіць большага памеру, чым астатнія, і інш.

Сучасны навучальны працэс павінен улічваць як тэндэнцыі развіцця навукі і тэхнікі, так і патрабаванні грамадства да якасці адукацыйных паслуг.

Адным з найбольш эфектыўных шляхоў для выканання такой задачы

цалкам правамерна лічаць мэтанакіраванае выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у выхаваўчым працэсе. Улічваючы тэмпы развіцця воблачных тэхналогій, неабмежаваныя магчымасці воблачнаарыентаваных навучальных асяроддзяў, ІКТ дазваляюць не толькі разнастаіць вучэбна-выхаваўчы працэс, але і ўкараніць новыя тэхналогіі навучання, у прыватнасці «перавернутае».

Перавернутае (перакуленае) навучанне (англ. *Flipped learning*) – гэта тэхналогія ажыццяўлення працэсу навучання, у якой мяркуецца, што навучэнцы з дапамогай гаджэтаў праслухоўваюць і праглядаюць відэаўрокі, вывучаюць дадатковыя крыніцы самастойна (у пазаўрочны час), а затым у класе ўсе разам абмяркоўваюць новыя паняцці і розныя ідэі, а настаўнік дапамагае прымяняць атрыманыя веды на практыцы. Такая арганізацыя навучання пабуджае навучэнцаў вучыцца адзін у аднаго.

Настаўнікі-мовазнаўцы для ўрокаў беларускай мовы, на жаль, такіх матэрыялаў маюць не вельмі шмат. І таму іх падрыхтоўка да ўрокаў і эфект у параўнанні з урокамі калег часам бываюць непараўнальнымі ў многіх выпадках.

Арганізацыйныя мадэлі вучэбнага ўзаемадзеяння навучэнца і настаўніка мяняюцца. Ва ўмовах інфарматызацыі яны наступныя:

- Класна-ўрочная мадэль.
- Праектна-групавая мадэль.
- Мадэль індывідуальнай дзейнасці.

Камунікацыя ў адукацыі – вобласць даследаванняў, якая развіваецца і ўключае ў сябе міжасобасныя, асобасныя, групавыя і культурныя спосабы зносін у класных памяшканнях. Яна вывучае як вербальныя, так і невербальныя віды камунікацый у класе. Надаецца таксама ўвага такім цяжкасцям камунікацыі паміж навучэнцамі, як камунікатыўнае разуменне, адсутнасць навыкаў ўспрымання на слых і праблемы самавыяўлення. З кожным годам усё больш і больш настаўнікаў выкарыстоўваюць у сваёй працы сродкі ІКТ, рыхтуючы да ўрокаў:

• слайдавыя прэзентацыі;
• відэакліпы;
• метадычныя матэрыялы;
• наглядныя дапаможнікі і г. д.

Праца ў праграмах Microsoft Word, Microsoft Office PowerPoint, Microsoft Office Publisher дазваляе ствараць інфармацыйныя прадукты (ІКТ-суправаджэнне) для выкарыстання на ўроках і пазакласных мерапрыемствах. Таму на сучасным этапе становіцца актуальным стварэнне агульнарэспубліканскага інфармацыйнага банка дадзеных падобных электронных дапаможнікаў. Гэта дазволіць аптымізаваць працэс падрыхтоўкі вучэбных заняткаў і пазакласных мерапрыемстваў, а таксама будзе спрыяць распаўсюджванню перадавога педагагічнага вопыту настаўнікаў, якія крэатыўна думаюць і творча працуюць.

Агульныя асаблівасці тэхналогіі «Перакуленае навучанне»:

• патрабуе больш часу для планавання і падрыхтоўкі настаўніка;
• мае цяжкасці прыцягнення ў навучальны працэс асобных катэгорый навучэнцаў;
• прадугледжвае пастаянны доступ навучэнцаў да камп'ютэраў і інтэрнэту.

Асаблівасці выкарыстання тэхналогіі «Перакуленае навучанне» для вучня:

•больш часу праводзіць перад камп'ютэрам;
•няроўныя магчымасці доступу да сеткі Інтэрнэт;
•выкарыстоўваюцца разнастайныя гаджэты;
•хатняе заданне з'яўляецца абавязковай часткай ўрока;
•вядзецца крытычная ацэнка вучэбнай дзейнасці;
• бывае цяжка прывыкнуць да новай тэхналогіі навучання.

Хоць праблема застаецца ў тым, што не ўсе вучні маюць доступ да высакахуткаснага Інтэрнэту або камп'ютэра, але, варта адзначыць, што за апошняе дзесяцігоддзе доступ вучняў да камп'ютэраў і сеткі Інтэрнэт дома значна пашырыўся.

Асаблівасці выкарыстання тэхналогіі «Перакуленае навучанне» для настаўніка:

•ажыццяўленне далейшага ўдасканалення навучальных матэрыялаў;
•ажыццяўленне персаналізаванага падыходу;
•валоданне рознымі ІК-тэхналогіямі;
•валоданне тэхналогіямі групавой працы;
•падтрымка ў сваёй навучальнай установе.

Часам мадэль перакуленага навучання вінавацяць у паслабленні ролі настаўніка. На самай справе пераход да гэтай мадэлі адкрывае шлях да павышэння важнасці ролі настаўніка ў навучанні. Вызвалены за кошт прэвадкастынга час настаўнік можа траціць на больш складаныя прафесійныя задачы – замацаванне і паглыбленне ведаў, што атрымалі вучні самастойна.

Перакуленае навучанне часта блытаюць з дыстанцыйным навучаннем. Адрозненне ляжыць на паверхні – час класнай працы «тварам да твару» застаецца без змяненняў, прынцыпова змяняецца толькі яе змест.

Некаторыя крытыкі перакуленага навучання сцвярджаюць, што гэтая мадэль пагаршае традыцыйны аспект адукацыі з-за немагчымасці аператыўна задаць пытанні лектару.

Лічым: разумнае спалучэнне сродкаў ІКТ і жывога вялікага беларускага слова, памножанае прафесіяналізмам настаўніка, дапамогуць убачыць наша маладое пакаленне як высокакультурную асвечаную нацыю.

## *Літаратура*


1. Мурина, Л. А. Курс риторики в контексте модернизации образования / Л. А. Мурина [і інш.]// Риторика в модернизации образования. – М., 2004. – С. 178–181.
2. Величко, В.В., Карпиевич, В. Инновационные методы образования. – Минск: Медисонт, 1999.
3. Жуковіч, М.В. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных установ. – Мінск: Аверсев, 2005.
4. Яленскі, М.Г. Асобасны падыход у рускай і замежнай навуцы/ М.Г. Яленскі// Народная асвета. – 2000. – № 9.
5. Использование ИКТ технологии на уроках русского языка и литературы [Электронная крыніца]. – Рэжым доступу: https://урок.рф. – Дата доступу: 08.02.2018.
6. Bergmann, J., Sams, A. «Flip your classroom: reach every student in every class every day» (2012) [Электронная крыніца] / Washington, DC: International Society for Technology in Education. – Рэжым доступу: https://www.liceopalmieri.gov.it/wp-content/uploads/2016/11/Flip-Your-Classroom.pdf. – Дата доступу: 07.02.2018.
7. Marshall, H. W. (2013, March 21). Three reasons to flip your classroom [Электронная крыніца]. – Рэжым доступу: http://www.slideshare.net/lainemarsh/3-reasons-to-flip-tesol-2013-32113. – Дата доступу: 07.02.2018.